Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»

Репозиторий БарГУ

# РЭСПУБЛІКАНСКІЯ КУПАЛАЎСКІЯ ЧЫТАННІ

*Зборнік навуковых артыкулаў*

Гродна
ГрДУ імя Я.Купалы
2009

УДК 882.6
ББК 83.3
Р96

Рэдакцыйная калегія:
кандыдат філалагічных навук, дацэнт *У.І.Каяла* (адк. рэд.);
доктар філалагічных навук, прафесар кафедры
беларускай літаратуры *І.В.Жук*;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт *Д.М.Лебядзевіч*;
кандыдат філалагічных навук. дацэнт *А.М.Петрушкевіч*;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт *Т.І.Тамашэвіч*.

Рэцэнзенты:
*Бельскі А.І.*, доктар філалагічных навук, прафесар (БДУ);
*Пяткевіч А.М.*, кандыдат філалагічных навук,
прафесар кафедры беларускай культуры і рэгіянальнага турызму
ГрДУ імя Я. Купалы.

Р96 **Рэспубліканскія** Купалаўскія чытанні : зб. навук. арт. / ГрДУ імя Я. Купалы ; рэдкал.: У.І.Каяла (адк. рэд.) [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2009. – 387 с.
ISBN 978-985-515-115-0

Аснову зборніка склалі матэрыялы Рэспубліканскіх Купалаўскіх чытанняў, якія адбыліся 11-12 красавіка 2008 года ва Установе адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы». У артыкулах асэнсоўвасцца спадчына народнага паэта Беларусі Янкі Купалы, асвятляюцца актуальныя праблемы літаратуразнаўства і мовазнаўства. Адрасуецца выкладчыкам ВНУ, настаўнікам гімназій, ліцэяў, школ, аспірантам і студэнтам. За дакладнасць інфармацыі адказнасць нясуць аўтары артыкулаў.

**УДК 882.6**
**ББК 83.3**

**ISBN 978-985-515-115-0**

© Установа адукацыі
«Гродзенскі дзяржаўны універсітэт
імя Янкі Купалы», 2009

Репозиторий БарГУ

*Лісоўская Іна Самсонаўна,* кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай мовы Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы, Гродна, Рэспубліка Беларусь.

*Лісоўская Юлія Міраславаўна,* студэнтка 3-га курса філалагічнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы, Гродна, Рэспубліка Беларусь.

УДК 821.161.3 (092 Я.Купала)

*А.У.Літвінскі*

# МІКІТА ЗНОСАК ЯК ВОБРАЗ ЗАХОДНЕРУСІСТА

Рассматривается персонаж трагикомедии Янки Купалы «Здешние» Микита Зносак в качестве исторического, этнокультурного и социально-психологического типа западноруссиста.

Трагікамедыя «Тутэйшыя» – гэта выкладзены на мове драматургії філасофска-гістарычны роздум Янкі Купалы над складанай і супярэчлівай доляй Бацькаўшчыны-Беларусі. Дзея гэтага выдатнага твора адбываецца ў 1918 – 1920 гг., у лёсавызначальны для краіны час, калі яна адчула ледзяны подых гістарычных вятроў розных накірункаў, у чарговы раз стаўшы арэнай геапалітычных канфліктаў.

Ва ўмовах барацьбы за ўладу над гэтай зямлёй паміж Савецкай Расіяй, Германіяй і Польшчай і няпэўнасці, выкліканай дадзеным фактарам, цяжка было знайсці сваё трывалае месца ў жыцці тутэйшым людзям. Персанажы трагікамедыі – фігуры, безумоўна, знакавыя і сімвалічныя – знаходзяцца ў псіхалагічнай сітуацыі паміж трывогай і надзеяй.

На што ж спадзяецца цэнтральны персанаж твора Мікіта Зносак? Носьбітам якіх ідэй ён з'яўляецца? І чаму нястомны змагар за справу беларускага нацыянальнага Адраджэння Янка Купала менавіта яго вывеў на сцэну ў якасці тыповага прадстаўніка тагачаснага беларускага грамадства? Каб адказаць на гэтыя ўзаемазвязаныя пытанні, варта прааналізаваць такую з'яву грамадска-палітычнага і навуковага жыцця дакастрычніцкай Беларусі, як заходнерусізм, паколькі, на наш погляд, вобраз Мікіты – бліскучае мастацкае ўвасабленне сацыяльнага тыпу заходнерусіста.

Уласна кажучы, тэрмін «заходнерусізм» мы не сустрэнем у Янкі Купалы ў «Тутэйшых». Гэты тэрмін (у рускамоўнай форме «западно-руссизм») і ягонае вызначэнне паспрабаваў увесці ў гістарычную навуку вядомы беларускі палітычны дзеяч, публіцыст і даследчык мінуўшчыны А.Цьвікевіч [10, с. 7] (толькі паспрабаваў, бо ягоная праца, напісаная ў 1928 г., дайшла да чытача са спазненнем на 65 гадоў, а сам ён трагічна загінуў у 1937 г. як адзін са шматлікіх «ворагаў народа»). Можна пагадзіцца з вызначэннем А.Цьвікевіча і прыйсці да высновы, што заходнерусізм – гэта плынь расійскай і беларускай грамадска-палітычнай і навукова-гістарычнай думкі другой паловы XIX – пачатку XX ст., прадстаўнікі якой адмаўлялі права бе-



Рэпазіторый БарГУ

ларусаў на існаванне ў якасці самастойнага, асобнага ад вялікарускага, этнаса. Самае большае, на што яны былі згодныя, – гэта на прызнанне за беларусамі статуса этнаграфічнай групы ў складзе адзінага рускага народа.

Ідэйным натхняльнікам заходнерусізму быў вядомы ў свой час гісторык, прафесар Пецярбургскай духоўнай акадэміі, ураджэнец Беласточчыны М.В.Каяловіч [3, с. 175, 200 – 202; 7, с. 230 – 246]. У сваіх працах ён адстойваў тэзіс аб шкоднасці польска-каталіцкага ўплыву на гісторыю «Западной России» (Беларусі, Літвы, Украіны – А.Л.) і аб выратавальнасці яе ўваходжання ў склад Расійскай імперыі [5, с. 43, 50 – 54, 92 – 96, 117 – 141, 222, 370 – 377].

Зразумела, М.В.Каяловіч і яго паслядоўнікі развівалі дадзены навукова-гістарычны пастулат у тым духу, што неабходна і надалей змагацца супраць усяго неправаслаўнага і нярускага ў краі. «Мы цвёрда стаялі на варце святога расійскага самаўладства і баранілі тутэйшую рускую народнасць ад «інародчаскага засілля» – гэтыя словы Мікіты ў канцэнтраваным выглядзе ўтрымліваюць ідэйна-палітычны «сімвал веры» заходнерусістаў [6, с. 459]. Карыстаючыся падтрымкай афіцыйнага Пецярбурга, прыхільнікі разгляданай ідэалагічнай дактрыны стварылі сетку навуковых і навучальных устаноў, якія павінны былі спрыяць выхаванню беларусаў у духу адданасці імперыі. Маці «Нікіцiя», Ганулян са скрухай зазначае, што «Мікітка вучыўся, але, мабыць, не давучыўся, і выйшла з яго ні Богу свечка ні чорту качарга» [6, с. 518]. Недавучанасць такіх, як Зносак, была вынікам тэндэнцыйнасці і аднабаковасці тагачаснай адукацыі. Тагачасная расійская школа аніяк не садзейнічала фарміраванню беларускай нацыянальнай самасвядомасці.

Цікава, што Мікіта не падмацоўвае сваю акрэсленую жыццёвую пазіцыю якімісьці гістарычнымі аргументамі. У гэтым сэнсе ён нетыповы заходнерусіст (але толькі ў гэтым сэнсе), паколькі яго аднадумцы імкнуліся зрабіць з гістарычнай навукі зброю для барацьбы з польскім уплывам. Затое былы калежскі рэгістратар з павагай ставіцца да Усходняга і Заходняга вучонага, нават не здагадваючыся, што іх, з дазволу сказаць, навуковыя пазіцыі адрозніваюцца, як дзень і ноч [6, с. 455, 466 – 468, 487 – 488, 501 – 502]. Пры гэтым погляды паланізаванага Заходняга вучонага зусім не спрыяюць абароне «тутэйшай рускай народнасці». Затое Усходні вучоны з'яўляецца, так бы мовіць, «заходнерусістам у квадраце».

Дадзеныя вобразы п'есы, безумоўна, парадыйныя. Аднак пры ўсёй парадыйнасці іх прататыпы рэальна існавалі. Купала мог сустракацца з імі, прынамсі, знаёміцца з іх псеўданавуковымі опусамі. Справа ў тым, што на глебе заходнерусізму з'явілася шмат папулярызатараў гісторыі, якія, па прычыне даволі нізкай кваліфікацыі і крайняй тэндэнцыйнасці не абцяжарвалі сябе пошукамі ісціны, а прапагандавалі сваю ідэалогію [7, с. 254 – 264]. У сувязі з гэтым трэба адзначыць, што пад уплывам ідэй заходнерусізму знаходзіліся і многія сур'ёзныя навукоўцы, напрыклад, Я.Карскі [10, с. 332 – 333]. Аднак погляды гэтага класіка беларусазнаўства не перашкодзілі яму ў справе стварэння сапраўды навуковых прац [4]. Ды наўрад ці чыталі творы Я. Карскага тыя людзі, збіральным вобразам якіх Купала зрабіў Мікіту.



Репозиторий БарГУ

У галоўнага персанажа трагікамедыі былі іншыя настаўнікі і аўтарытэты: Пурышкевіч, Скрынчанка, Саланевіч [6, с. 486]. Усе яны з'яўляліся рэальнымі гістарычнымі асобамі, прадстаўнікамі кансерватыўна-манархічнага лагеру. Сучаснікі Купалы, дасведчаныя ў грамадска-палітычнай сітуацыі, што склалася на Беларусі ў так званы «нашаніўскі перыяд», выдатна разумелі, аб кім і аб чым ідзе гаворка і носьбітам чыіх ідэй паказаны «Нікіцій Зносілов».

Сярод «духоўных бацькоў» Мікіты неабходна вылучыць такую па-свойму каларытную фігуру, як Л.М.Саланевіч. Як заўзяты «западноросс» ён у пачатку XX ст. фактычна прэтэндаваў на ролю ідэйнага і палітычнага лідэра заходнерусісцкага руху і ў пэўнай ступені яе выконваў. Погляды Л.М.Саланевіча афарміліся да пачатку мінулага стагоддзя. Ва ўсялякім разе яны былі даволі сістэматычна выкладзены ў ягонай гістарычнай працы, што пабачыла свет у 1901 г. [8]. Уласна кажучы, нічога новага ў гістарычнай навуцы Л.М.Саланевіч не адкрыў, ды і не збіраўся гэтага рабіць. Ён проста паўтарыў тое, што ўжо было сказана М.В.Каяловічам і іншымі прыхільнікамі заходнерусісцкай канцэпцыі гісторыі Беларусі. Тэзісы Л.М.Саланевіча зводзіліся да наступнага: край гэты (Гродзеншчына, а ў шырэйшым сэнсе слова – і ўся Беларусь) – спрадвечна-рускі, ўсё зло для яго – ад Польшчы і «лацінства», далучэнне Беларусі да Расіі мела станоўчае значэнне [8, с. 5 - 11, 14 – 16, 32]. Такім чынам, ён зарэкамендаваў сябе якраз у якасці аднаго з прапагандыстаў і папулярызатараў, для якіх было недаступнае ўяўленне пра гісторыю як пра складаны, супярэчлівы і неадназначны працэс.

Заходнерусісты, як вядома, апантана змагаліся з польскім уплывам на Беларусь і з усялякімі праявамі польскага нацыянальнага руху. Аднак у першыя гады XX ст. у іх з'явіўся новы ідэйны апанент – беларускі нацыянальны рух. Зразумела, правадыр новага пакалення паслядоўнікаў М.В.Каяловіча разгарнуў актыўную дзейнасць па «нейтралізацыі штучнага беларускага сепаратызму, які мог бы ўвагнаць клін паміж двума плямёнамі аднаго і таго ж народа і пасеяць паміж імі варожасць» (тут і далей пераклад з рускай мовы наш – А.Л.) [9, с 29]. У якасці барацьбіта з «беларускім сепаратызмам» Л.М.Саланевіч даўся ў знакі многім прыхільнікам справы беларускага нацыянальна-культурнага Адраджэння. Вядома, што ён быў адным з найбольш актыўных ідэйных апанентаў Янкі Купалы, асабліва ў час калі паэт узначаліў рэдакцыю «Нашай нівы».

У артыкуле «За «А ўсё ж такі мы жывём!..», апублікаваным на старонках «Нашай Нівы» ў 1914 г., Купала, адказваючы на публіцыстычныя інвектывы Саланевіча, параўнаў таго з «совамі і начніцамі» і назваў «перакінчыкам» [6, с. 546]. Палемізуючы са сваім апанентам, ён выказаў шчырае спадзяванне на тое, што «беларус добра патрапіць раскумекаць, хто і як да яго гаворыць і хто яму болей родны і вечны, а хто чужы і дачасны» [6, с. 546].

Аднак, на жаль гэтыя спадзяванні спраўджваліся не заўсёды. Як адзначаюць даследчыкі, «нельга не прызнаць, што ў значнай ступені асноўнай сваёй мэты – русіфікацыі края і русіфікацыі масавай гістарычнай свядомасці беларусаў да 1914 г. яны (заходнерусісты – А.Л.) дасягнулі» [3, с. 205].

Вось чаму «найздальнейшы вучань Саланевіча» Мікіта Зносак і стаў мастацкім увасабленнем зусім рэальнага ва ўмовах першай чвэрці XX ст. этнасацыяльнага тыпу зрусіфікаванага «тутэйшага».

У чым была прывабнасць заходнерусісцкай ідэалогіі для прататыпаў галоўнага персанажа Купалавай п'есы? Нельга зводзіць прычыны іх з'яўлення на гістарычнай арэне толькі да ўздзеяння тагачаснай сістэмы адукацыі. Не ўсе ж паддаваліся такому ўздзеянню – інакш не адбылося б на Беларусі нацыянальнае Адраджэнне. Мы наблізімся да адказу на гэтае пытанне, калі прыгадаем, што Мікіта спадзяецца на аднаўленне сваёй чыноўніцкай кар'еры і на працяг сваёй дзейнасці па адстойванні ідэй «ядынасці, непадзельнасці і самадзяржаўнасці Расійскай, межджу протчым, імперыі» [6, с. 517]. Мусіць, няблага было такім, як Мікіта, у часы існавання гэтай імперыі.

Справа ў тым, што заходнерусізм узнік і развіваўся як ідэалогія своеасаблівага сацыяльна-палітычнага і культурна-гістарычнага рэваншу, своеасаблівае пераадоленне комплекса непаўнавартасці (тут дарэчы будзе нагадаць Мікітава імкненне любым чынам паказаць уласную значнасць). Многія з ягоных лідэраў і адэптаў паходзілі з сем'яў уніяцкіх святароў. У часы Рэчы Паспалітай уніяцтва, хаця і пашырыла свой уплыў, стаўшы рэлігіяй значнай большасці беларусаў, усё ж такі заставалася плебейскай рэлігіяй другога гатунку ў параўнанні з рымскім каталіцызмам. Памяць пра шматлікія крыўды з боку панаваўшай у Рэчы Паспалітай каталіцкай царквы, натхняла былых уніятаў, якія пасля Полацкага сабора 1839 г. перайшлі ў праваслаўе, на нястомную барацьбу з усім польскім і каталіцкім.

У гэтай барацьбе з польскасцю быў яшчэ і прагматычны аспект. Заходнерусісты, усяляк паказваючы сваю вернасць царскаму ўраду чакалі ад яго канкрэтных мерапрыемстваў у адказ. Асабліва яны былі зацікаўлены ў як мага больш рашучым абмежаванні польскага землеўладання на Беларусі, а таксама ў тым, каб самім тут заняць прыбытковыя дзяржаўныя пасады. Аднак меркаванні дваранскай салідарнасці для царызму доўгі час былі найважнейшымі за вернападданніцтва разначынцаў-«западноросов» – польскае памешчыцкае землеўладанне істотна не абмяжоўвалася, а пасады займалі дваране, якія з'яўляліся ўраджэнцамі ўнутраных губерняў Расіі [10, с. 278 – 284].

Сітуацыя змянілася, калі ў 1906 г. расійскі ўрад узначаліў П.А.Сталыпін – рашучы прыхільнік русіфікацыі края. Ён свядома імкнуўся зрабіць сваёй сацыяльна-палітычнай апорай у Беларусі менавіта мясцовае заможнае сялянства праваслаўнага веравызнання. Канечне ж, Саланевіч, які сам паходзіў з беларускіх сялян, і ягоныя аднадумцы горача віталі такі намер былога гродзенскага губернатара. У ажыццяўленні гэтага намеру яны ўбачылі гістарычны шанец заняць тут пануючае становішча і развілі ў дадзеным накірунку актыўную дзейнасць [10, с. 299 – 310].

Мы атаясамліваем заклік»людзьмі звацца», які Янка Купала скіраваў да беларусаў, са справай нацыянальнага Адраджэння. І гэта сапраўды так. А вось заходнерусісты спадзяваліся павысіць свой сацыяльны статус і дамагчыся самарэалізацыі іншым шляхам. Яны ахвотна ішлі насустрач русіфікацыйнам памкненням афіцыйнага Пецярбурга, паколькі гэта адпавядала

іх інтарэсам. Беларускасць магла ім толькі пашкодзіць, і таму яны супраць яе апантана змагаліся. Таму няма нічога дзіўнага ў выразнай антыбеларускай пазіцыі цэнтральнага персанажа «Тутэйшых».

Такім чынам, Мікіта Зносак як мастацкі вобраз, безумоўна, увасабляе тып заходнерусіста – рашучага апанента беларускай нацыянальнай ідэі. Ствараючы дадзены вобраз, Янка Купала меў на ўвазе шматлікіх рэальных прататыпаў Мікіты – актыўных прыхільнікаў ідэалогіі заходнерусізму, якія ўсяляк перашкаджалі справе станаўлення беларускай нацыі. Вобраз Мікіты – гэта і канстатацыя факта, і мастацкае абагульненне, і прарочае папярэджанне.

*Спіс літаратуры*


1. Барабаш, Ю. Сиамские близнецы / Ю.Барабаш // Дружба народов. – 1996. – № 9. – С. 182 – 202.
2. Доўнар-Запольскі, М.В. Гісторыя Беларусі / М.В.Доўнар-Запольскі. – Мінск: Бел. Энцыклапедыя, 1994. – 509 с.
3. Карев, Д.В. Белорусская и украинская историография конца XVIII – начала 20-х гг. XX в. в процессе генезиса и развития национального исторического сознания белорусов и украинцев / Д.В.Карев. – Вильнюс: ЕГУ, 2007. – 312 с.
4. Карскі, Я. Беларусы / Я.Карскі. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. – 640 с.
5. Коялович, М. О. Лекции по истории Западной России / М.О.Коялович. – М., 1864. – 348 с.
6. Купала, Я. Выбраныя творы / Я.Купала. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2002. – 640 с.
7. Литвинский, А., Карев, Д. Западноруссизм в российской историографии второй половины XIX – начала XX века // Стэфан Баторый у гістарычнай памяці народаў Усходняй Еўропы / А.Литвинский, Д.Карев. – Гродна: ГЦДУЕ, 2004. – С. 195 – 324.
8. Солоневич, Л.М. Краткий исторический очерк Гродненской губернии за сто лет её существования 1802 – 1902 / Л.М.Солоневич. – Гродно, 1901. – 106 с.
9. Солоневич, Л.М. Новая роль польской женщины в Белоруссии и Литве / Л.М.Солоневич. – Вильно, 1910. – 30 с.
10. Цьвікевіч, А. «Западно-руссизм»: Нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / А.Цьвікевіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.



In given article is considered personage to tragicomedies Yankee Kupaly «Tuteyshya» Mikita Znosak as history, folkcultural and social-psychological type westrussian-language.



***Літвінскі Аляксандр Уладзіміравіч***, кандыдат гістарычных навук, ст. выкладчык кафедры філасофіі і гісторыі Баранавіцкага дзяржаўнага універсітэта, Баранавічы, Рэспубліка Беларусь.


Рэпазіторый БарДУ

УДК.811.161.3(092 Я.Купала)

*С.Г.Ляскевіч*

## «НА ПАГАРДЖАЙЦЕ ЛАПЦЯЎ ЛАЗОВЫХ»: НАЗВЫ АДЗЕННЯ І АБУТКУ Ў ЗБОРНІКУ Я.КУПАЛЫ «ЖАЛЕЙКА»


Рассматриваются особенности функционирования наименований одежды и обуви в сборнике «Жалейка» классика белорусской литературы Янки Купалы. Отмечается,